**А. Я. ПАЎЛАВА, С. М. НЕДАБОЙ**

# ДАКУМЕНТЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА-МУЗЕЯ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ДЗЕЙНАСЦІ ДЗЯРЖАЎНАГА МАСТАЦКАГА МУЗЕЯ БССР

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У артыкуле вывучаюцца магчымасці выкарыстання дакументаў архіўнага фонду Дзяржаўнага мастацкага музея БССР у якасці крыніцы па гісторыі дзейнасці музея ў 1944—1984 гг. Прадстаўлена характарыстыка відаў справаводчай дакументацыі, якая знаходзіцца ў музейным фондзе. Аўтарамі робіцца выснова аб ступені рэпрэзентатыўнасці і дакладнасці вывучаных крыніц.

Authors observe the complex of documents which are kept in archive-museum.Particular attention is payed to the analysis of the history of creation, representativeness and authenticity of office documents.

*Ключавыя словы*: БДАМЛМ, архіўны фонд, Дзяржаўны мастацкі музей БССР, віды дакументаў.

*Keywords*: Historical sources, archival fond, State museum of fine arts, main directions of activities, record-keeping, types of documents.

Дакументальныя крыніцы па гісторыі стварэння і дзейнасці сённяшняга Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь знаходзяцца ў трох архіўных комплексах.

Даволі часта даследчыкі музейнай справы спасылаюцца на матэрыялы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ). У архіве дакументы па дзейнасці мастацкага музея знаходзяцца ў фондзе № 7 — «Савет Міністраў» і ў фондзе № 974 — «Міністэрства культуры». У абазна-

**Паўлава Алена Якаўлеўна** — дацэнт кафедры гісторыі Беларусі музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, кандыдат гістарычных навук; **Недабой Соф'я Міхайлаўна** — навуковы супрацоўнік Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Я. Раманава.

чаных фондах захоўваюцца пастановы савецкіх органаў аб дзейнасці музейных устаноў Беларусі і дакументы, якія кожны музей павінен адсылаць вышэйстаячым органам.

У складзе Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ) улічаны фонд № 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР», які ўключае ў свой склад два вопісы спраў пастаяннага захоўвання. Агульная колькасць спраў фонду — 331.

Трэці комплекс — гэта архіў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, створаны на пачатку 1994 г. На сучасным этапе архіў разам з бібліятэкай з'яўляецца часткай аднаго з аддзелаў музея. Архіў — самастойная архіўная адзінка на ўліку Дэпартамента па архівах і справаводстве. У архіве захоўваюцца ўсе дакументальныя матэрыялы за перыяд з другой паловы 1980-х гг. да сённяшняга часу, шмат капійных матэрыялаў, арыгіналы якіх знаходзяцца ў БДАМЛМ. Тут зберагаюцца асабістыя калекцыі, у тым ліку і дакументальныя матэрыялы А. В. Аладавай. У планах кіраўніцтва музеем ператварыць архіў у самастойную структурную адзінку Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Такім чынам, дакументальныя крыніцы па гісторыі і дзейнасці вядучага мастацкага музея краіны ўяўляюць сабой асобныя комплексы.

На жаль, гісторыя стварэння фонду «Дзяржаўны мастацкі музей БССР» і вывучэнне прыгаданага комплексу дакументаў дагэтуль не выклікалі адпаведнай цікавасці як сярод навукоўцаў-музейшчыкаў, так і сярод архівістаў. У той жа час неабходна адзначыць, што інфармацыя аб вывучаемым фондзе была прадстаўлена ва ўбачыўшым свет у 1997 г. даведніку «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва» [3]. Як крыніцу можна выкарыстаць артыкулы з матэрыялаў канферэнцый, праведзеных музеем. Прыкладам служыць артыкул дырэктара БДАМЛМ Г. В. Запартыкі «Матэрыялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь у фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва». У ім змяшчаюцца цікавыя звесткі аб дзейнасці галерэі па матэрыялах фонду [4, с.133—139].

Архіўны фонд БДАМЛМ № 164 «Дзяржаўны мастацкі музей БССР» фарміраваўся на працягу 1967—1984 гг. Гэта дакументы справаводства. Сціслая гістарычная даведка да фонду, падпісаная дырэктарам А. В. Аладавай, паведамляе, што пастановай СНК БССР № 109 ад 24 студзеня 1939 г. у сістэме Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР была арганізавана Беларуская дзяржаўная карцінная галерэя ў г. Мінску (далей — ДКГ). Упершыню вопіс №1 спраў пастаяннага захоўвання фонду

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

№ 164 быў складзены і падпісаны ў 1970 г. дырэктарам Дзяржаўнага мастацкага музея БССР (далей — ДММ БССР) А. В. Аладавай і старшынёй экспертнай камісіі ДАЛМ БССР К. Коравай. Вопіс складзены па храналагічным прынцыпе.

Вопіс 1 з 2-х тамоў (адпаведна 158-я і 173-я справы) складзены па храналагічным прынцыпе. Першы том утрымоўвае справы 1944—1967 гг. За гэты час галерэя была адроджана і нават змяніла назву ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР ад 10 ліпеня 1957 г. № 423 і Загадам Міністэрства культуры БССР ад 25 ліпеня 1957 г. № 371 Дзяржаўная карцінная галерэя БССР перайменавана ў Дзяржаўны мастацкі музей БССР [1, арк. 1]. Да вопісу складзена гістарычная даведка, якая змяшчае гісторыю музея з 1939 па 1957 г. У прыгаданай даведцы прыведзены ўсе назвы музея за азначаны перыяд. Вопіс змяшчае інфармацыю аб падпарадкаванні Дзяржаўнай карціннай галерэі спачатку СНК БССР з 1939 г., а з 1957 г.— Міністэрству культуры.

Другі том вопісу ўтрымоўвае справы 1968—1984 гг. і пабудаваны па храналагічна-функцыянальным прынцыпе [2, арк. 1]. На жаль, у вопісе не пазначана дата, калі архіў ДММ БССР упершыню падвергся навукова-тэхнічнай апрацоўцы. Між іншым канстатуецца, што была праведзена экспертыза каштоўнасці дакументальных матэрыялаў. На матэрыялы, якія не падлягаюць далейшаму захоўванню, быў складзены акт на знішчэнне. Справы пастаяннага тэрміну захоўвання і па асабовым складзе падшыты, пранумараваны, апісаны [1, арк. 1].

У 1979 і 1986 гг. была праведзена чарговая навукова-тэхнічная апрацоўка дакументаў музея за 1968—1975 і 1976—1984 гг. адпаведна. У выніку апрацоўкі былі дапоўнены вопісы спраў пастаяннага захоўвання па асабовым складзе. У 1979 г. праведзена навукова-тэхнічная апрацоўка дакументаў мясцовага камітэта прафсаюзнай арганізацыі музея (пратаколы справаздачна-перавыбарчых і агульных прафсаюзных сходаў, пасяджэнняў мясцовага камітэта, фінансавыя справаздачы). Вопіс складзены па храналагічным прынцыпе, унутры гадавых раздзелаў справы размешчаны па значнасці [2, арк. 1]. У 1986 г. праведзена навукова-тэхнічная апрацоўка дакументаў музея за 1976—1984 гг. Загады дырэктара па асноўнай дзейнасці і па асабовым складзе за 1976—1979 гг. фармаваліся разам і ўвайшлі ў вопіс № 1 другога тома. Пратаколы пасяджэнняў фондавай камісіі носяць характар пералічэння твораў, якія выбылі з фондаў музея ў іншыя галерэі рэспублікі і адносяцца да ўнутраных уліковых дакументаў. Перапіска музея з Міністэрствам культуры БССР за 1976, 1977, 1979, 1981 гг. мае адміністрацыйна-гаспадарчы характар і была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўключана ў акт на знішчэнне. Справы сістэматызаваны па храналагічна-намінальнай схеме [2, арк. 6].

Дакументы фонду ўяўляюць сабой у большасці арыгіналы — белавікі, але сустракаюцца і чарнавікі. У асноўным дакументы падрыхтаваны на паперы фармату А4, некаторыя лісты адрозніваюцца па памеры і прапорцыям. Дакументы надрукаваны машынапіссю ці напісаны ўручную. Маюць месца дублікаты і копіі дакументаў, часам дакументы напісаны ў двух ідэнтычных экзэмплярах: адзін напісаны ад рукі, другі — надрукаваны. Асноўная частка комплексу захавалася добра. Аднак значная частка першых пасляваенных дакументаў зроблена на тонкай паперы, са шматлікімі пашкоджаннямі. Самыя раннія крыніцы адносяцца да 1944 г.

У фондзе № 164 адклаліся дакументы справаводства структурных падраздзяленняў музея і вышэйстаячых устаноў. Усе матэрыялы можна падзяліць на звычайнае і спецыялізаванае (музейнае) справаводства. Па функцыянальным прызначэнні комплекс дакументаў агульнага справаводства падзяляецца на арганізацыйна-распарадчую, планава-справаздачную, пратакольную дакументацыю, службовую перапіску. Спецыялізаванае музейнае справаводства звязана са складваннем у пасляваенны час спецыялізаванай дакументацыі для забеспячэння музейнай дзейнасці: кнігі паступленняў, інвентарныя кнігі па жанрах і іншыя ўліковыя дакументы, матэрыялы для экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай дзейнасці. Па намінальнай прыкмеце можна выдзеліць пастановы і распараджэнні Савета Міністраў СССР і БССР, Міністэрства культуры СССР і БССР, загады кіраўніцтва БММ БССР па асноўнай дзейнасці і асабовым складзе, пратаколы, планы і справаздачы, акты, перапіску. Неабходна адзначыць, што дастаткова часта дакументы не вельмі дакладна размеркаваны па храналагічным прызнаку. Так, напрыклад, дакументы за 1947 г. трэба шукаць таксама і сярод матэрыялаў за 1946 і 1948 гг., а дакументы за 1962 г. могуць знаходзіцца сярод папер 1940-х гг., што пэўным чынам ускладняе працу даследчыка.

Сярод дакументацыі неабходна вызначыць загады кіруючых органаў, а менавіта СНК СССР, СНК БССР, пастановы ЦК КП(б)Б і Міністэрства культуры, распараджэнні Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК СССР і СНК БССР. Цікавым уяўляецца загад Міністэрства культуры СССР № 378 ад 16 кастрычніка 1965 г. аб змяненні рэжыму работы музеяў сістэмы Міністэрства культуры, падпісаны міністрам Е. А. Фурцавай [10, арк. 7]. Большасць дакументаў за перыяд 1944—1947 гг. звязана з пытаннямі аднаўлення дзейнасці галерэі, арганізацыі вяртання яе фондаў. Аднак некаторыя загады датычацца і праблем забеспячэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаванасці. Так, у дакументах фонду захавалася пастанова ГУУС па Мінскай вобласці аб спыненні функцыянавання памяшканняў галерэі па адрасе: г. Мінск, пл. Свабоды, 41 за 1949 г. Прычынай такога рашэння паслужыла невыкананне дырэктарам музея А. В. Аладавай прадпісання Дзяржпажарнагляду ад 18 кастрычніка 1948 г. аб перамяшчэнні сховішчаў у больш прыстасаванае памяшканне [6, арк. 9]. Для забеспячэння поўнага ўліку і лепшай захаванасці мастацкіх каштоўнасцей карціннай галерэі іх неабходна было сабраць у адзіным сховішчы. Да 1957 г. галерэя месцілася ў чатырох пакоях Дома прафсаюзаў. Таму ў пастанове начальнік МУС па Мінскай вобласці і г. Мінску маёр Васкрасенскі, разгледзеўшы матэрыял стану Дзяржаўнай карціннай галерэі, размешчанай у г. Мінску на плошчы Свабоды (над Музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны), адзначыў парушэнне — сховішча галерэі, размешчанай на 2-м паверсе, мела паўзгаральныя перакрыцці. Загадам Дзяржпажарнагляду ад 12 кастрычніка 1948 г. дырэктару прапаноўвалася перамясціць сховішча ў пажарабяспечнае памяшканне. Аднак тэрміны скончыліся, а прапанова не была выканана. У мэтах захавання дзяржаўнай маёмасці ад агню, кіруючыся пунктам 4 Палажэння аб Дзяржпажарнаглядзе, зацверджанага ЦВК і СНК СССР за № 52/654 ад 07.04.1936 г., вырашана спыніць функцыянаванне сховішча, шляхам апячатвання [7, арк. 9].

За перыяд 1950—1970-х гг. загады кіруючых органаў маюць дачыненне да асноўнай дзейнасці музея: арганізацыя выстаў на базе сваіх фондаў і іншых савецкіх і замежных музеяў, работа па папулярызацыі выяўленчага мастацтва сярод насельніцтва, непасрэдна па рэжыме работы музейнай установы, адкрыцці філіялаў ДММ БССР у г. Магілёве, Мазырскім раёне і г. д. Сярод дакументаў 1969 г. можна ўбачыць загады аб змене ўнутранага распарадку музея ў сувязі з рамонтам будынка, загады аб узмацненні супрацьпажарнай бяспекі, аб правядзенні выстаў, аб стварэнні інвентарызацыйнай камісіі для ацэнкі дзейнасці гаспадарчых службаў. Сустракаюцца загады, якія датычацца святаў, такіх як 8 Сакавіка, Першамая, Перамогі, 7 Лістапада, дзе дырэктар музея віншуе сваіх супрацоўнікаў з гэтым святам, жадаючы ім добрага здароўя, высокай ініцыятывы ў працы і асабістага шчасця [15, арк. 1].

Загадам № 56 ад 5 чэрвеня 1969 г. — у сувязі са шкоднымі ўмовамі працы і ў адпаведнасці з рашэннем мясцовага камітэта прафсаюза — было назначана харчаванне за кошт музея па 0,5 літра малака ў суткі старэйшаму рэстаўратару М. М. Куйчыку, малодшаму рэстаўратару В. С. Харанека і загадчыку фоталабараторыяй Ю. А. Іванову з 6 чэрвеня 1969 г. [15, арк. 10].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У комплексе архіўных матэрыялаў захаваліся штогадовыя планы дзейнасці ДММ БССР за перыяд з 1944 па 1984 г. Планы неабходна было прадстаўляць у кіруючыя органы БССР і СССР не пазней 1 студзеня. Па выніках вывучэння планаў работы музея неабходна адзначыць, што на працягу азначанага перыяду не існавала цэнтралізаванай уніфікаванай формы і патрабаванняў да складання гэтага віду дакументацыі. Тым не менш у працэсе дзейнасці музея сфарміравалася даволі ўстойлівая структура плана работы музейнай установы.

Часцей за ўсё планы пачыналіся з вызначэння галоўных задач музейнай установы на азначаны год. Далей у штогадовых планах выдзяляліся наступныя накірункі дзейнасці: экспазіцыйна-выставачная, папулярызацыйная, навуковая і ахоўная (адным блокам). Акрамя таго, у кожным плане пазначаўся бюджэт музея на вызначаны тэрмін. Планаванне дзейнасці па кожным накірунку ўключала як агульныя палажэнні, так і дакладныя мерапрыемствы. У плане на 1949 г. па навукова-даследчым накірунку прадугледжвалася падрыхтаваць да выдання тры каталогі: да выстаўкі мастакоў Савецкай Беларусі, прысвечанай 30-годдзю БССР, да 10-й гадавіны ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР і да выстаўкі з нагоды 70-годдзя І. В. Сталіна [6, арк. 5]. Гэтым жа планам прадугледжвалася напісанне супрацоўнікамі шэрагу дакладаў і артыкулаў у мясцовую прэсу, але ж без дэталёвых удакладненняў па тэматыцы і без назваў друкаваных СМІ.

У складзе фонду прадстаўлены справаздачы музея аб асноўных відах дзейнасці і справаздачы навуковых супрацоўнікаў. Справаздачы пісаліся адпаведна з патрабаваннямі Упраўлення па справах мастацтваў пры Міністэрстве культуры СССР. У асноўным гэта арыгіналы. Справаздачы аб дзейнасці музея складаліся за розныя перыяды. Першая справаздача — за 1949 г. Да 1959 г. справаздачы вышэйстаячым органам складаліся штогадова, з 1959 г. — штоквартальна і кожныя поўгода. Прычым у архіўным фондзе не заўсёды знаходзяцца паўгадавыя ці квартальныя справаздачы. У справаздачах пазначаліся якасныя і колькасныя паказчыкі па асноўных накірунках дзейнасці музея. На жаль, пры адсутнасці аднароднасці і непаўнаце колькасных дадзеных амаль немагчыма правесці параўнанне паказчыкаў дзейнасці музея за некалькі гадоў.

Справаздачы з'яўляюцца добраструктураваным відам крыніц. Структура штогадовых справаздач музея час ад часу змянялася. Трэба адзначыць, што па меры стварэння айчыннай музеязнаўчай тэорыі некаторыя накірункі дзейнасці музея змянялі назвы і перамяшчаліся з аднаго блока ў дакуменце ў другі. Тым не менш у большасці выпадкаў у струк-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры справаздач можна выдзеліць наступныя накірункі дзейнасці: экспазіцыйна-выставачная дзейнасць, работа з наведвальнікамі, са школьнікамі, папулярызацыя калекцый музея, рэклама, улік, інвентарызацыя, каталагізацыя музейных прадметаў, навукова-даследчая, метадычная дзейнасць, камплектаванне і экспедыцыйная дзейнасць.

Першая сярод аналізуемых справаздач адносіцца да 1949 г. Яна складзена на бланку ў адпаведнасці з патрабаваннямі Галоўнага ўпраўлення па справах выяўленчага мастацтва СССР (аддзел музеяў). Справаздача была падрыхтавана ў тэрмін — да 15 студзеня 1950 г. У 1954 г. суцэльнай справаздачы аб рабоце не прадстаўлена. Яна існуе ў раздробленым выглядзе. Асаблівасцю справаздач за 1949 і 1954 гг. з'яўляецца прыкладзеная форма № 9. На бланку гэтага дакумента, які адсылаўся ў г. Маскву, прадугледжвалася інфармаванне кіраўніцтва музейнай галіной па шэрагу паказчыкаў: адрас музея, агульная плошча, экспазіцыйная плошча, профіль, наяўнасць рады музея. Акрамя таго, у форме пазначалася агульная колькасць прадметаў у музеі, колькасць праінвентарызаваных прадметаў, колькасць прадметаў у экспазіцыі. Указваліся і паказчыкі масавай работы музея: колькасць рабочых дзён, наведвальнікаў (усяго і па групах — экскурсанты, школьнікі), экскурсій, лекцый, выстаў пастаянных і перасоўных (у музеі і па-за музеем). На жаль, з 1955 па 1976 г. такіх дакументаў не захавалася [8, арк. 5].

Можна пазначыць, што ўніфікаванай формы для іх напісання не існавала да сярэдзіны 1960-х гг. Па меры стварэння айчыннай музеязнаўчай тэорыі некаторыя накірункі дзейнасці музея змянялі назвы і перамяшчаліся з аднаго блока ў дакуменце ў другі. Так, у справаздачы за 1949 г. вызначаны наступныя накірункі дзейнасці: навукова-даследчая дзейнасць і інвентарызацыя, да якой аднесена і праца па каталагізацыі фондаў галерэі, экспазіцыйна-выставачная і палітыка-асветніцкая дзейнасць, павышэнне кваліфікацыі і ідэйна-палітычная работа з супрацоўнікамі галерэі [8, арк. 8]. У справаздачы за 1954 г. выдзяляюцца толькі два накірункі: навукова-даследчая і культмасавая работа, да якой аднесены інвентарызацыя бібліятэчных фондаў, а таксама індывідуальныя кансультацыі наведвальнікаў па экспазіцыі галерэі [10, арк. 13]. У справаздачы за 1959 г. па традыцыі першым блокам ідзе навукова-асветніцкая дзейнасць [12, арк. 18]. Асобнымі часткамі выдзелены лекцыйная дзейнасць, арганізацыя выстаў, рэклама і папулярызатарская дзейнасць музея. У справаздачы за 1964 г. на першае месца быў выдзелены блок масава-папулярызатарскай дзейнасці [14, арк. 152], а затым размесціліся часткі аб экспазіцыйна-выставачнай, навукова-папулярызатарскай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

і навукова-даследчай. Асобна пададзены ўлік і захаванне [14, арк. 157]. Прыкладна ў такім жа парадку пабудаваны справаздачы за 1969, 1974, 1979 і 1984 гг. Метадычная дзейнасць, рэклама, работа з супрацоўнікамі, дзейнасць бібліятэкі і фоталабараторыі на працягу вывучаемага перыяду размяшчаліся ў розных частках справаздач.

Апісаная сітуацыя магла быць выклікана некалькімі прычынамі. У азначаны перыяд у музеі працавалі вузкія спецыялісты, перш за ўсё мастацтвазнаўцы. З другога боку, першы айчынны падручнік, у якім былі выкладзены тэарэтычныя асновы музеязнаўства, убачыў свет толькі ў 1955 г. Хутчэй за ўсё тагачасныя супрацоўнікі галерэі дзейнічалі інтуітыўна і пры адсутнасці ўстойлівай тэрміналогіі размяркоўвалі віды музейнай дзейнасці адпаведна сваім асабістым уяўленням. Мажліва, што дырэктар галерэі А. В. Аладава не надавала ўвагі складанню справаздач.

Акрамя таго, у фондзе захаваўся шэраг справаздач навуковых супрацоўнікаў за 1954—1959 гг.: галоўнага захавальніка П. М. Герасімовіча, В. А. Баравік, Р. Г. Бадзіна і С. Д. Палееса. Структура гэтых справаздач паўтарае структуру адпаведных музейных дакументаў.

У бухгалтэрыі ствараліся адпаведныя фінансавыя дакументы. Гэта самыя аб'ёмныя справы. Асабліва шмат каштарысаў захавалася за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.

У складзе фонду захавалася некалькі відаў пратаколаў: пратаколы закупачных камісій (1946, 1951 гг.), пасяджэнняў Вучонай рады (1961—1975), метадычнай рады, мясцовага камітэта (1961—1975), пратаколы прафсаюзных сходаў. У фондзе захаваліся арыгіналы гэтага віду дакументаў. Усе пратаколы правільна аформлены і падпісаны. На працягу першай паловы 1950-х гг. у галерэі вяліся пратаколы па размеркаванні мастацкіх твораў і пратаколы пасяджэнняў секцыі выяўленчых мастацтваў Беларускага рэспубліканскага камітэта супрацоўнікаў мастацтваў. За 1960-я гг. захаваліся таксама пратаколы Дзяржаўнай экспертнай камісіі, выставачнага камітэта Міністэрства культуры БССР.

Дакументы фонду ўтрымліваюць вялікую колькасць службовай перапіскі (1944—1954, 1968—1984). Сабраны шырокі пласт перапіскі кіраўніцтва музея з органамі кіравання, са шматлікімі ўстановамі і арганізацыямі, а таксама з фізічнымі асобамі. Сярод кіруючых устаноў, перапіска з якімі захавалася, можна вызначыць СНК СССР, СНК БССР, ЦК КП(б)Б, Упраўленне па справах мастацтваў. Уваходзячая дакументацыя прадстаўлена арыгіналамі, напісанымі на бланках, з адпаведнымі подпісамі і пячаткамі. Часта на іх маюцца рэзалюцыі дырэктара музея. Лісты, ініцыяваныя кіраўніцтвам ДММ БССР, пераважна захаваліся ў копіях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе большасць перапіскі прысвячалася праблеме аднаўлення дзейнасці галерэі. Асноўная тэма лістоў была звязана з вяртаннем твораў мастацтва з калекцыі ДКГ БССР на радзіму пасля завяршэння вайны. Сярод перапіскі аб праблемах па набыцці твораў мастацтва для абноўленай галерэі выдзяляецца ліст з Упраўлення культуры Ленінградскага гарвыканкама, В. Г. Артамонаў нагадвае кіраўніцтву Міністэрства культуры БССР, што яшчэ ў 1947 г. у сховішча музейных фондаў прыгарадных палацаў-музеяў паступілі вернутыя з Германіі творы мастацтва (35 адзінак), якія належаць беларускім музеям. Беларускім уладам неаднаразова паведамлялася аб гэтым. Аднак да канца 1954 г. адказ так і не быў атрыманы. Ленінградцы прасілі Міністэрства культуры БССР усё ж такі выслаць свайго прадстаўніка для прыёму і адпраўкі экспанатаў у Мінск [11, арк. 6].

У 1950-я гг. быў пабудаваны новы будынак музея. Адпаведна, амаль усе лісты з 1955 па 1957 г. уключна звязаны з арганізацыяй гэтай будоўлі. Пачынаючы з 1950-х гг. вялікая колькасць службовых лістоў прысвячалася пытанням арганізацыі выстаў і іншым формам культурна-адукацыйнай дзейнасці. Шмат лістоў маюць дачыненне да арганізацыі перасоўных выстаў з калекцыі музея: удакладняўся час, месца і тэрмін правядзення, разглядаліся пытанні транспартнай дастаўкі і забеспячэння захаванасці экспанатаў.

У справе № 177 за 1969 г. прыцягваюць увагу тры дакументы. Першы ліст напісаны дырэктарам ДММ БССР А. В. Аладавай кіраўніку Упраўлення музеяў СССР А. І. Ермалаеву. У ім гаворыцца пра «трафейны фонд», які складаецца з партрэтных гравюр працы замежных мастакоў. Ёсць падставы меркаваць, што гэты фонд да 1941 г. з’яўляўся ўласнасцю ДММ БССР (паступленне 1939—1940 гг. з Нясвіжскага замка князёў Радзівілаў). Наколькі было вядома, Літаратурны музей не быў зацікаўлены ў захаванні трафейнага фонду. У той жа час ДММ БССР востра меў патрэбу ў ім па прычыне адсутнасці ў зноў створаных пасля вайны калекцыях музея твораў графікі. Дырэктар мастацкага музея пераканаўча прасіла перадаць ім трафейны фонд гравюр, які налічваў 2000 адзінак захоўвання і радаводу, альбомы партрэтаў пачатку XIX ст. [16, арк. 9].

Другі ліст — ад былога рэстаўратара В. П. Савіна, за час працы ён сабраў багатую бібліятэку па пытаннях рэстаўрацыі твораў з металу, дрэва і інш. — 53 найменні. Пасля выхаду на пенсію гатоў быў прадаць яе ДММ БССР. Акрамя бібліятэкі ў спадара В. П. Савіна мелася скульптура «Хлопчык» работы Ділона, якую ён таксама хацеў прапанаваць для набыцця музеям [16, арк. 19].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэці ліст паказвае, што ДММ БССР не толькі збіраў сваю калекцыю, але і дзяліўся творамі нацыянальнага мастацтва з іншымі музейнымі ўстановамі СССР. У ім А. В. Аладава прапанавала дырэктару Данецкага мастацкага музея падараваць з нагоды 100-годдзя г. Данецка работы беларускіх майстроў мастацтваў [16, арк. 26].

У складзе фонду захаваліся справаводчыя дакументы па асабовым складзе супрацоўнікаў музея. Штатны расклад захаваўся ва ўсіх гадавых раздзелах вопісу № 1. Пачынаючы з 1968 г. можна прасачыць колькасныя паказчыкі па складзе супрацоўнікаў музея. Гэта наступныя віды дакументаў: статыстычныя дадзеныя аб колькасці і складзе спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй адукацыяй, дадзеныя аб колькасці кіруючага апарату, інфармацыя аб размеркаванні супрацоўнікаў па пасадах, аб павышэнні кваліфікацыі. З 1976 г. прыгаданая інфармацыя прадстаўлялася ў формах № 1, 8 а, 6 т і г. д.

Захавалася і копія Акта выдачы экспанатаў № 895 ад 30 верасня 1939 г., па якім па распараджэнні дырэктара Дзяржаўнага рускага мастацкага музея Н. А. Цыганова шэраг графічных работ з дуплетнага фонду перадаваўся для пастаяннага захоўвання ў Мінскую галерэю [5, арк. 65].

Дакументы спецыялізаванага музейнага справаводства ўключаны ва ўсе гадавыя раздзелы вопісу (1944—1967). Гэта акты і вопісы на паступленне новых прадметаў (экспанатаў), інвентарныя кнігі экспанатаў (па жанрах), акты прыёму-перадачы экспанатаў у часовае карыстанне, акты прыёму новых паступленняў, акты руху экспанатаў пастаяннага захоўвання. Гэтыя дакументы спецыялізаванага музейнага справаводства ўключаны ва ўсе гадавыя раздзелы вопісу (1944—1967). Аднак БДАМЛМ перадаў іх на пастаяннае захаванне ў архіў ДММ БССР.

Да цікавых дакументаў за 1944 г. адносіцца справа № 2, Вопіс музейных каштоўнасцей, вывезеных у Германію, складзены А. В. Аладавай. Вопіс мае раздзелы: жывапіс, графіка, скульптура, прыкладное мастацтва, асобна ўключаны «Спіс работ беларускіх мастакоў XIX—XX стст., што захаваліся ў ДКГ БССР і былі вывезены гітлераўцамі ў Германію і ў краіны-паплечніцы ці знішчаны ў ходзе іх дзеянняў»: 221 адзінка жывапісу, 47 гравюр і літаграфій, 120 малюнкаў, 41 скульптура. Дакумент завяршаецца даведкай аб Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР, падпісанай кіраўніком Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР П. С. Пестракам. Згодна даведцы ўсе ўключаныя ў спісы творы прыводзяцца па памяці супрацоўнікаў галерэі і сведак [4, арк. 60].

Захавалася дакументацыя, прысвечаная аднаўленню будынка ДКГ БССР пасля вайны і будаўніцтву новага будынка музея. Сярод іх мож-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на адзначыць копіі пастаноў СНК БССР і СМ БССР, смету аднаўленчых выдаткаў за 1949 г., гадавы спіс капітальных работ на 1954 г., графік ажыццяўлення аўтарскага нагляду за будаўніцтвам музея на 1953 г. [8, арк. 4].

Прадстаўленне аб дакументах па гісторыі ДММ БССР, якія знаходзяцца на захаванні ў БДАМЛМ, будзе няпоўным без згадвання архіваў асабістага паходжання мастакоў і мастацтвазнаўцаў, чый лёс быў звязаны з дзейнасцю музея. Гэта — фонды галоўнага захавальніка музея, а пазней загадчыка навукова-фондавым аддзелам П. М. Герасімовіча, які працаваў у музеі з 1945 па 1982 г. (Ф. 301 — 231 адзінка захавання), старшага навуковага супрацоўніка і вучонага сакратара ДКГ БССР С. Д. Палееса, які вярнуўся на працу ў музей у 1947—1958 гг. (Ф. 382 — 810 адзінак захавання). Цікавыя матэрыялы аб дзейнасці ДММ БССР можна знайсці ў фондах мастакоў І. В. Ахрэмчыка, І. М. Басава, М. А. Блішча, В. В. Волкава, П. Н. Гаўрыленкі, С. П. Геруса, А. В. Грубе, Я. А. Зайцава, Я. Я. Красоўскага, У. М. Кудрэвіча, У. Ф. Сакалова, М. Л. Тарасікава, А. М. Тычыны, А. М. Чуркіна і інш.

Такім чынам, вывучэнне складу комплексу дэманструе значную ступень сапраўднасці і рэпрэзентатыўнасці матэрыялаў: комплекс утрымлівае асноўныя віды справаводчай дакументацыі па ўсіх аспектах развіцця музейнай дзейнасці.

Па выніках даследавання можна вызначыць, што найбольш падрабязна ў дакументах за перыяд з 1944 па 1984 г. адкладаліся матэрыялы па трох асноўных кірунках дзейнасці музея: навукова-фондавая, экспазіцыйна-выставачная і культурна-адукацыйная работа. Акрамя таго, у дакументах фонду прадстаўлены інфармацыя аб аднаўленні дзейнасці галерэі пасля вайны і матэрыялы, якія маюць дачыненне да штату супрацоўнікаў музея, дзейнасці бібліятэкі і фоталабараторыі.

Комплекс дакументацыі дазваляе прасачыць асноўныя этапы развіцця музея на працягу 1944—1984 гг. Згодна з дакументацыяй фонду на працягу ўсяго азначанага перыяду супрацоўнікі музея праводзілі велізарную культурна-адукацыйную работу па папулярызацыі мастацтва сярод насельніцтва БССР. Музей актыўна выкарыстоўваў разнастайныя формы і метады музейна-педагагічнай дзейнасці: ад класічных экскурсій і лекцый да мастацтвазнаўчых гурткоў і спецыялізаваных музейна-педагагічных праграм. Асобная ўвага, пачынаючы з самага 1944 г., надавалася рабоце са школьнікамі. З матэрыялаў фонду вынікае, што кіраўніцтва музея актыўна займалася выдавецкай дзейнасцю і рэкламай сваіх мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дакументы ўтрымліваюць багаты матэрыял аб дзейнасці асобных супрацоўнікаў музея (Р. Г. Бадзіна, В. А. Баравік, Н. Ф. Высоцкай, П. М. Герасімовіча, С. Д. Палееса, І. Н. Паньшынай, Т. А. Рэзнік і Т. І. Сцешынай). Акрамя таго, у архіўных крыніцах магчыма прасачыць развіццё музеязнаўчай тэрміналогіі і асаблівасці дакументавання музейнай дзейнасці.

Такім чынам, комплекс дакументаў, які захаваўся ў фондзе № 164 БДАМЛМ «Дзяржаўны мастацкі музей БССР», з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі развіцця музейнай установы.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (далее — БГАМЛИ). Ф. 164. Оп. 1. Историческая справка к фонду «Государственный художественный музей БССР». 1944—1967 гг.

2. БГАМЛИ. Ф. 164. Оп. 1. Государственный художественный музей БССР. Т. 2.

3. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва: даведнік. Мінск : БелНДІДАС, 1997. 257 с.

4. *Запартыка Г. В.* Матэрыялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь у фондах Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва: навук.-практыч. канф., прысвечаная 65-годдзю з дня заснавання НММ РБ, г. Мінск, 9—11 ліст. 2004 г. // Музей XXI стагоддзя: актуальныя праблемы дзейнасці; навук. рэд. Н. М. Усава. Мінск, 2008. С. 133—139 с.

5. БГАМЛИ. Ф. 164. Оп. 1. Д. 2. Описи музейных ценностей, вывезенных фашистскими оккупантами в Германию в 1944 г.

6. Там же. Д. 28. Справка о работе государственной картинной галереи БССР со времени ее восстановления. 1944 г.

7. Там же. Д. 37. Приказы Управления по делам искусств при СМ БССР и Совета Министров БССР за 1949 г.

8. Там же. Д. 38. Годовой план и отчет за 1949 г.

9. Там же. Д. 59. Переписка со строительными организациями по вопросу строительства здания в 1953 г.

10. Там же. Д. 61. Годовой план и отчет за 1954 г.

11. Там же. Д. 65. Переписка с Главным управлением по делам искусств БССР по вопросу деятельности галереи в 1954 г.

12. Там же. Д. 83. Годовой план и отчет за I полугодие 1959 г.

13. Там же. Д. 127. Приказы МК БССР за 1964 г.

14. Там же. Д. 135. Годовой отчет о работе за 1964 г.

15. Там же. Д. 170. Приказы директора музея по основной деятельности музея за 1969 г.

16. Там же. Д. 177. Переписка с организациями и частными лицами об организации выставок, приобретении картин и др. за 1969 г.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 15 чэрвеня 2012 г.